**Ермалаеў, С.** Трыумф, які каваўся ўпартай працай / С. Ермалаеў // Герой працы (Шуміліна). – 2022. – 18 сак. – С. 1, 4.

**ТРЫУМФ, ЯКІ КАВАЎСЯ ЎПАРТАЙ ПРАЦАЙ**

**15 сакавіка ў полацкім Сафійскім саборы адбылося ўзнагароджанне лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны». Пяцідзесяці прадстаўнікам прадпрыемстваў і арганізацый народнай гаспадаркі і сацыяльнай сферы Віцебскай вобласці па выніках работы за 2021 год старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін уручыў дыпломы, нагрудныя знакі і прэміі памерам у 100 базавых велічынь.**



**Старшыня райвыканкама Сяргей Галынчык з лаўрэатамі Ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны» Паўлам Трафімавым, Вячаславам Федзюком і Аляксеем Шпакавым.**

– Жамчужына старажытнай архітэктуры – Сафійскі сабор – сімвалізуе гістарычную памяць беларускага народа, яго імкненне да незалежнасці, эканамічнай магутнасці, высокай культуры. Гэта адносіцца і да лаўрэатаў ганаровага звання «Чапавек года Віцебшчыны». Гэта ўзнагарода – не імгненны трыумф, а аўтарытэт, які каваўся гадамі, прафесіяналізм, упартасць, прагрэсіўныя падыходы, – сказаў Аляксандр Міхайлавіч. – Няма сумненняў у тым, што вы зробіце нашмат больш, чым расказваюць пра вас узнагародныя лісты і прадстаўленні. Ваша добрасумленная праца, мэтанакіраванасць адкрываюць новыя гарызонты ў самых розных галінах і ўмацоўваюць імідж Віцебскай вобласці.

Старшыня аблвыканкама адзначыў, што 2021 год быў няпросты, але выніковы. Высокіх паказчыкаў дабіліся многія прамысловыя прадпрыемствы, фінансавыя і гандлёвыя арганізацыі, работнікі і кіраўнікі якіх атрымалі ўзнагароды. Асаблівая ўвага – сельскагаспадарчым арганізацыям,

перапрацоўчым прадпрыемствам аграпрамысловага комплексу, у якім занята 20 працэнтаў працуючых у рэальным сектары эканомікі і які дае пятую частку валавога рэгіянальнага прадукту.

Сярод узнагароджаных кіраўнікі прадпрыемстваў, якія робяць значныя інвестыцыі ў развіццё вытворчасці, у стварэнне інавацыйнай прадукцыі.

Адукацыя, культура, сацыяльнае абслугоўванне – узнагароды ўручаліся прадстаўнікам усіх сфер дзейнасці. Сёлета сярод лаўрэатаў абласной прэміі шмат моладзі – спартсмены, навучэнцы ўстаноў адукацыі культуры, студэнты, якія сталі пераможцамі Алімпійскіх гульняў і чэмпіянатаў свету, міжнародных конкурсаў.

У сваім выступленні кіраўнік вобласці адзначаў, што ў 2021 годзе буйныя інвестыцыі былі ўкладзены ў Шумілінскі раён, асабліва ў сферу жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва і добраўпарадкаванне. Не выпадкова ў намінацыі «жыллёва-камунальная гаспадарка, будаўніцтва і архітэктура, паліўна-энергетычны комплекс, сувязь, транспарт і камунікацыі» дыпломы лаўрэатаў уручаны двум прадстаўнікам Шуміліншчыны.

«Важкі ўклад у развіццё галіны ўносіць дырэктар унітарнага прадпрыемства ЖКГ Шумілінскага раёна **Аляксей Шпакаў**. Пад яго кіраўніцтвам да абласных «Дажынак» у Шуміліне праведзены работы па рэканструкцыі цеплавых сетак на пяці аб’ектах, другога пускавога комплексу цэнтральнай кацельні, бягучы рамонт 28 жылых дамоў», – адзначыў Аляксандр Субоцін. Таксама лаўрэатам звання стаў абліцоўшчык-плітачнік камунальнага ўнітарнага будаўнічага прадпрыемства «Шумілінская ПМК-70» **Вячаслаў Фядзюк**. Дарэчы, Вячаслаў зараз працуе на рэканструкцыі гістарычных будынкаў, размешчаных каля Сафійскага сабора, у якіх будзе месціцца Полацкае кадэцкае вучылішча.




**Аляксандр Субоцін уручае дыплом лаўрэата Ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны» Вячаславу Федзюку.**

Ганаровае званне ў намінацыі «Забеспячэнне законнасці і правапарадку, папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый, дзейнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання, грамадскіх арганізацый» атрымаў і ўчастковы інспектар міліцыі аддзялення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Шумілінскага РАУС **Павел Трафімаў**, які прызнаны лепшым участковым Беларусі.

У завяршэнне, звяртаючыся да лаўрэатаў, Аляксандр Субоцін сказаў:

– Вынікі, якіх вы змаглі дабіцца, маюць асаблівую каштоўнасць для нашай вобласці. Сваёй дзейнасцю вы даказваеце, як бязмежна многа можа чалавек, які рухаецца жаданнем зрабіць свой край мацней і прыгажэй. Шчыра віншую вас з заслужаным прызнаннем! Вялікі дзякуй за добрасумленную працу, самааддачу, ініцыятыву і наватарства! Верце ў сябе, упэўнена глядзіце ў будучыню, будуйце яе сваімі рукамі!

Завяршылася мерапрыемства святочным канцэртам. Выкананнем твораў класічнай музыкі слухачоў парадавалі заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ксенія Пагарэлая (арган), камерны аркестр «Еўропа-Цэнтр» пад кіраўніцтвам дырыжора Раіля Садыкава, салісты Наваполацкага дзяржаўнага музычнага каледжа.

**Сяргей ЕРМАЛАЕЎ.**